Інтэрнэт-праект 2009
©SVJAZEP.ORG



# Малы КАЛЯДНЫ СЬПЕЎНІК

## 1. АНЁЛ СКАЗАЎ ПАСТУШКАМ

1. Анёл сказаў пастушкам:
“Нарадзіўся Хрыстос вам!”
А дзе – дзе? У Бэтлеі Давідавым,
У пакаленні юдавым,
Ад Дзевы Марыі.

2. Гэта хочучы спазнаць,
Вестку шчасну аглядаць,
Пабеглі да Бэтлею з ахвотай,
Знайшлі ў яслях Дзіцятка,
Марыю з Язэпам.

3. Хвалы вечнай Бог зступіў,
Як просты сябе зніжыў.
Палацаў багатых, мураваных
Ня меў пабудаваных
Бог усяго стварэння.

4. Слухайце ж Бога Айца,
Як аб Ім Ён нам сказаў:
“Гэта Сын мой адзіны,
Каханы ў раі вам абяцаны,
слухайце Яго вы.”

5. Богу чэсць і хвала будзь,
Што ніколі не замруць,
Як Айцу, так Ягонаму Сыну,
Разам Святому Духу, -
Адзінаму ў Тройцы!

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇



Радасць у сэрцах гарыць,
радасць у сэрцах гарыць.

2. Ціхая ноч, дзіўная ноч,
голас з неба зыйшоў:
“Сёння нам нарадзіўся Хрыстос.
Ад грахоў Ён збаўленне прынёс.
Праўда прарочых слоў,
праўда прарочых слоў”

3. Ціхая ноч, дзіўная ноч,
анёл вёў пастушкоў
да хлявочка, там, дзе Божы Сын
меў палац у час сваіх нарадзін
горшы за бедакоў,
горшы за бедакоў.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

*Gloria! Gloria! Gloria! In excelsis Deo!*
*(або)*
*Слава, слава, слава на вышынях Богу!*

2. Пастушкі на полі са страху памлелі,
Як на гэты цуды ў поўначы глядзелі;
Тады анёл ім зьявіўся,
Мовіў: “Бог вам нарадзіўся”.

3. Найсьвяцейша Дзева стала Маці Бога,
Ён адкупіць людзкасьць з моцы духа злога.
У стаенцы нарадзіла,
І на сенца палажыла.

4. І пабеглі дзеці з вялікай ахвотай,
Гралі і сьпявалі Богу стройнай нотай,
Свае сэрцы радавалі,
Што Ісуса аглядалі.

5. І мы засьпявайма Сыну-Богу хвалу,
Што для нас радзіўся і цярпеў нямала;
Выслаўляйма Збаўцу Бога,
Ў Сьвятой Тройцы адзінога.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

**13. ЦІХАЯ НОЧ**

1. Ціхая ноч, дзіўная ноч,
дрэмле ўсё, дый не спіць.
Па-над жолабам Маці стаіць,
на Дзіцятка з усмешкай глядзіць.



**2. А Ў СЬВЕЦЕ НАМ**

1. А ў сьвеце нам навіна была – Сьвяты вечар!
2. Там Прачыста Сына радзіла – Сьвяты вечар!
3. Ў небе зорачкі засьвяціліся – Сьвяты вечар!
4. Прыйшлі мудрацы, пакланіліся – Сьвяты вечар!
5. Каб забіць Дзіця Ірад сам пайшоў – Сьвяты вечар!
6. Ды да ясьляў шлях ніяк не знайшоў – Сьвяты вечар!
7. Узрасло Дзіця – Збаўца Хрыстос Бог – Сьвяты вечар!
8. Праўды сьвет знайсьці Ён нам дапамог – Сьвяты вечар!

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

**3. А ЎЧОРА З ВЯЧОРА**

1. А ўчора з вячора, засвяціла зора.
2. Зора засьвяціла, сьвет узвесяліла.
3. Сьвет узьвесяліўся, Хрыстос нарадзіўся.
4. Хрыстова раджэньне – людзям на збаўленьне.
5. Людзі, пасьпяшайце, Збаўцу прывітайце.
6. Здаровы бывайце, нам Каляду дайце.
7. Здаровы сьвяткуйце, дайце не шкадуйце.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 4. ДОБРЫ ВЕЧАР ТАБЕ

1. Добры вечар табе, пане гаспадару!

*Радуйся, ой радуйся, зямля, Сын Божы нарадзіўся!*

2. Засцілайце столы ўсе які маем.
3. Дый кладзіце калачы з'святое пшаніцы.
4. Дык прыйшлі к'нам жа тры Святы ў госці.
5. Ды першае свята Хрыстова Раджэнне.
6. А другое свята Святога Васіля.
7. А трэцяе свята Святое Хрышчэнне.
8. Справы адкладайце – Святы сустракайце!

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 5. ЗВОН ЗВІНІЦЬ (JINGLE BELLS)

1. Прыемна адчуваць,
Як конік мой бяжыць,
Як ззяе зорны снег вакол
Ды звон званчэй звініць.
Спяшаюцца ўсе
Ўсіх павіншаваць,
Ды звон збірае ўсіх сяброў
Каляды святкаваць.

Звон звініць, звон звініць,
Звон звініць званчэй.
Не знайсці у цэлым свеце
Тых званоў грамчэй. (x2)
2. Калядны мой вазок



## 11. НОЧКА ЦІХАЯ, ЗАРЫСТА

1. Ночка ціхая, зарыста, цуд – часіна:
Нарадзіла Дзева чыста Бога-Сына.
Згодна з воляй Госпада ўцелавіўся,
Каб нас выбавіць ад грэху аб'явіўся.

2. Нарадзіла Дзева Маці ў бядоце,
У паветцы, у нястачы, у клапоце.
І над гэтым Божа Маці бедавала
І, калышучы Дзіцятка, так сьпявала:

3. Сьпі мой міленькі Сыночак, Збаўца сьвету.
Выбачай, мой галубочак, беднасьць гэту.
Чым Цябе, Сыночак, маю спавіваці –
Твае ручанькі прыгожы прыкрываці?

4. Не пагардзіў Ты прыйсьці так на сьвет гэты,
У сукеначку ў мяне Ты не адзеты.
Толькі сенцам тут Цябе я атуляю, -
Невыгоды, можа, гэтым так спраўляю.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 12. ПАКАЗАЛАСЬ З НЕБА ЯСНАСЬЦЬ

1. Паказалась з неба яснасьць небывала,
Грамада анёлаў песьню заспявала:
“Хвала Богу на вышынях,
Спакой людзям на нізінах”.

4. Мудрацы слаўны (x2)
З Усходу прыходзяць,
Ладан і міру (x2)
Й золата прыносяць.

5. Госпаду слава (x2)
Дарункі складаюць
Пастушкі людзям (x2)
Аб усім зьвяшчаюць.

6. Вечнаму Богу (x2)
І мы паклон дайма;
“Слава на вышынях!” (x2) -
Яму засьпявайма.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 10. НОВА РАДАСЬЦЬ СТАЛА

1. Нова радасьць стала, што йшчэ не бывала:
Над Бэтлеем зорка ясна сьвету засіяла.

2. Дзе Хрыстос радзіўся, з Дзевы ўцелавіўся –
Нібы чалавек убогі ў пялёнкі спавіўся.

3. Пастушкі з ягняткам перад тым Дзіцяткам
Упадаюць на калені для Яго ўслаўленьня.

4. І мы засьпявайма, Хрыста праслаўляйма,
Ды народжанага з Дзевы пакорна ўпрашайма.

5. Прсім Цябе, Божа, просіма як можам:
Дай нам ў небе жыцьцё шчасна, на зямлі – прыгожа.



Спяшаецца ізноў
Прывезці падарункі ўсім,
Павіншаваць сяброў.
Хай песенька мая
Яшчэ грамчэй гучыць,
Няхай жадаюць шчасця вам
Ды звон званчэй звініць.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 6. ЗОРКА БЭТЛЕЕМСКА

1. Зорка Бэтлеемска над зямлёю зьзяе,
Радасную вестку людзям абвяшчае.

*Прыпеў:*

*Не сьпі, абудзіся! Хрыстос нарадзіўся!*
*З неба радасьць прамяніцца, будзем весяліцца.*

2. Промень Божай ласкі на зямлю праліўся,
Каб табе даць шчасьце Збаўца нарадзіўся.

*Прыпеў.*

3. Ўстань жа, не спазьніся правітаць Дзіцятка.
Да жыцьця ачніся, беларусе-братка.

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 7. НАРАДЗІЎСЯ, НАМ З'ЯВІЎСЯ

1. Нарадзіўся, нам з'явіўся між быдлятак у стайні Бог.
Хто ж Малому, дарагому даць хвалу там годна мог?
Пастушкі, вы паспяшайце, чэсць і хвалу Яму дайце,
вас Анёл туды заве. (x2)

2. Разам з вамі мы з мальбамі паспяшым туды хутчэй,
і Малога Сына Бога ўсцешым песняю сваёй.
Бо Ён бедным нарадзіўся, у жлабочку прытуліўся,
каб нас, грэшных, у небе мець. (x2)

3. Станем у кола і вясёла будзем "Глёрыя" спяваць.
Богам даны, Ён пасланы, каб збаўленне свету даць.
Шчыра тут Яго вітайма і з анёламі спявайма:
"Добрым людзям супакой." (x2)

3. Прывітайма, запытайма, хто прычынай гэта быў?
Скуль патрэба, што аж з неба на зямлю Бог сам сступіў?
Міласць Божа то зрабіла, Сына з неба падарыла,
каб у небе мы былі. (x2)

4. Чаму ж, Божа, жлоб – не ложа – з сена меў пасцель сабе;
Быдла грэла, літасць мела, а не людзі для Цябе?!
Грэшнік, злосці што паддаўся, і ў грахох нямоглым стаўся,
праз Цябе каб рай здабыў! (x2)

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇



## 8. НА РАСТВО ХРЫСТОВА

На Раство Хрыстова анёл паляцеў;
Ён зляцеў з неба – людзям песьню пеў:
Хутка паспяшайце,
Дзіцятка вітайце
Нованараджэннага!

◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇◇

## 9. НЕБА І ЗЯМЛЯ

1. Неба і зямля (x2)
Радасна сьпяваюць.
Анёлы сьвету (x2)
Дзіва абвяшчаюць.

*Прыпеў:*

*Хрыстос радзіўся, Бог аб'явіўся,*
*Анёлы сьпяваюць, пастушкі іграюць,*
*Дзіва, дзіва абвяшчаюць.*

2. У Бэтлееме (x2)
Вясёла навіна:
Чыстая Дзева (x2)
Нарадзіла Сына

3. Вечнае Слова (x2)
Успрыняла цела;
У цемры грэху (x2)
Сонца засьвяціла.